Пры вывучэнні гісторыі краю ў вучняў фарміруюцца грамадзянскасць, патрыятызм і нацыянальная самасвядомасць. Даследаванні, скіраваныя на ідэалагічнае, духоўна-маральнае і мастацка-эстэтычнае выхаванне, дазваляюць сфарміраваць патрэбу ў захаванні нацыянальнага культурнага здабытку, гістарычнай памяці, папулярызацыі традыцый беларускага народа.

# Імя мастачкі ў паралелі часу

## Патрыятычнае выхаванне навучэнцаў праз краязнаўчае даследаванне



**Кацярына Сяргееўна Прылішч,**
настаўнік гісторыі, грамадазнаўства, мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура) другой кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА «Раманаўская сярэдняя школа» Слуцкага раёна. Педагагічны стаж — 2 гады.

У рамках краязнаўчага даследавання навучэнцы і педагогі Ленінскага ВПК яслі — сад — сярэдняя школа (цяпер Раманаўская сярэдняя школа) рэалізавалі праект «Выбітныя дзеячы майго краю. Алена Кіш» (2021–2022).

Для распрацоўкі першай тэмы праекта была абрана асоба славутай мастачкі, якая нарадзілася ў мястэчку Раманава Слуцкага павета (цяпер аг. Леніна Слуцкага раёна) у сялянскай сям'і. Алена Кіш — яркі прадстаўнік наіўнага мастацтва, аўтарка знакамітых маляваных насценных дываноў з фантастычна-алегарычнымі сюжэтамі («Рай», «У райскім садзе», «Дзева на водах»), якія ствараліся падчас вандровак па вёсках Случчыны. Арыгінальныя па сюжэтах, яны не маюць аналогій у народным беларускім мастацтве. Тут спалучаюцца дэкаратыўна-арнаментальны і сюжэтны жывапіс. Аўтарству Алены Кіш належыць каля 300 маляванак, але захавалася 13. За выключэннем двух, усе яны захоўваюцца ў Заслаўі. Калі гаворка ідзе пра мастацкі роспіс на Беларусі, то ў першую чаргу згадваюць яе.

Мастацкая спадчына Алены Кіш належыць да найлепшых узораў творчага самавыяўлення беларускага народа. Упершыню творчасць мастачкі была прадстаўлена на 1-й Рэспубліканскай выставе народных маляваных дываноў (1978). Там экспанаваліся яе работы, знойдзеныя і адрэстаўраваныя мастаком У. Басалыгам. У «Сусветнай энцыклапедыі наіўнага мастацтва» імя мастачкі ў адным шэрагу з Ніко Пірасмані, Анры Русо і іншымі найбольш вядомымі мастакамі-прымітывістамі.

Падчас работы над праектам «Выбітныя дзея-

ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»